Журнал Белорусского государственного университета. История. 2021;2:104–105
Journal of the Belarusian State University. History. 2021;2:104–105

# МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «РИЖСКИЙ МИРНЫЙ ДОГОВОР 1921 г. В СУДЬБАХ НАРОДОВ ВОСТОЧНОЙ И ЦЕНТРАЛЬНОЙ ЕВРОПЫ (МИНСК, 26 МАРТА 2021 г.)

# МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «РЫЖСКІ МІРНЫ ДАГАВОР 1921 г. У ЛЁСАХ НАРОДАЎ УСХОДНЯЙ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЕЎРОПЫ» (МІНСК, 26 САКАВІКА 2021 г.)

# INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «RIGA PEACE TREATY OF 1921 IN THE FATES OF THE PEOPLES OF EASTERN AND CENTRAL EUROPE» (MINSK, 26 MARCH 2021)

Падпісанню аднаго з найбольш значных міжнародных дагавораў XX ст. – Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. – 18 сакавіка споўнілася 100 гадоў. Гэты дагавор не толькі стаў завяршэннем ваеннага канфлікту паміж РСФСР і Польскай Рэспублікай, але і вызначыў межы краін ва ўсходняй частцы Еўропы амаль на два дзесяцігоддзі, зафіксаваў расклад сіл супраціўных бакоў, заклаў новыя супярэчнасці ў міжнародных адносінах і адыграў важную ролю ў лёсах усіх народаў Усходняй і часткова Цэнтральнай Еўропы. Стагоддзю падпісання дагавора была прысвечана міжнародная навуковая канферэнцыя, якая адбылася 26 сакавіка 2021 г. на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Было заяўлена даволі шырокае праблемнае поле канферэнцыі, што дазволіла прыцягнуць да ўдзелу ў ёй спецыялістаў не толькі па пытаннях Рыжскага мірнага дагавора, гісторыі дыпламатычных адносін і міжнароднай палітыкі, але і даследчыкаў, якія займаюцца вывучэннем перыядаў непасрэдна да і пасля яго падпісання. Выбраны падыход найбольш адпавядае прынцыпу гістарызму, дзякуючы чаму ў заяўленых на канферэнцыю дакладах удалося больш комплексна і сістэмна разгледзець і ацаніць і працэсы, якія папярэднічалі Рыжскаму мірнаму дагавору і ў пэўнай ступені прадвызначылі далейшы ход падзей, і непасрэдныя вынікі яго падпісання. Праблемнае поле канферэнцыі ахоплівала пытанні падпісання Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. і еўрапейскай дыпламатыі гэтага перыяду, войнаў, рэвалюцый і сацыяльных канфліктаў на тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў канцы XIX – першай палове XX ст., фарміравання нацый і нацыянальных дзяржаў, сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў і этнаканфесійных працэсаў на тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў канцы XIX – першай палове XX ст., а таксама сучасных тэндэнцый і навацый вывучэння гісторыі краін гэтага рэгіёна ў акрэслены перыяд.

На адкрыцці канферэнцыі, якое папярэднічала пленарнаму пасяджэнню, да ўдзельнікаў навуковага форуму з прывітальным словам звярнуўся дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі і намеснік дэкана вучоны сакратар гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава Аксана Вячаславаўна Солапава.

На пленарным пасяджэнні, якое адбывалася ў змешаным фармаце з выкарыстаннем тэхналогій інтэрнэт-сувязі, з дакладамі выступілі знакамітыя навукоўцы і даследчыкі, чые працы прысвечаны даследаванню Рыжскага мірнага дагавора і пытанням заяўленага праблемнага поля: доктар гістарычных навук прафесар Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі (Мінск, БДУ), кандыдат гістарычных навук дацэнт Дзмітрый Аляксандравіч Андрэеў (Масква, Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава), доктар гістарычных навук прафесар Мечыслаў Эдвардавіч Часноўскі (Мінск, БДУ), доктар гістарычных навук прафесар Мікалай Мікалаевіч Мязга (Гомель, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны), доктар гістарычных навук прафесар Вячаслаў Іванавіч Менькоўскі (Мінск, БДУ), кандыдат гістарычных навук Вольга Мікалаеўна Бароўская (Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі). Даклады выклікалі жывы інтарэс з боку калег і прысутных. Завязалася дыскусія, якая працягнулася і пасля заканчэння пленарнага пасяджэння.

На міжнародным форуме прагучалі даклады больш чым 60 даследчыкаў з Беларусі, Расіі, Польшчы, Чэхіі ў межах працы трох секцый канферэнцыі: «Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і еўрапейская дыпламатыя ў 1918–1921 гг.» (мадэратары – доктар гістарычных навук прафесар Рыгор Рыгоравіч Лазько і кандыдат гістарычных навук дацэнт Андрэй Мікалаевіч Максімчык), «Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў 1921–1941 гг.» (мадэратары – кандыдат гістарычных навук дацэнт Любоў Антонаўна Козік і кандыдат гістарычных навук дацэнт Вікторыя Аляксандраўна Латышава), «Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў канцы XIX – пачатку XX ст.» (мадэратары – кандыдат гістарычных навук дацэнт Віталь Сяргеевіч Макарэвіч і кандыдат гістарычных навук


CC BY NC

дацэнт Ганна Іванаўна Маскевіч). Праца ўсіх секцыйных пасяджэнняў, асабліва першай секцыі, была вельмі плённай, выклікала жывую дыскусію і абмеркаванне ў адкрытым фармаце з удзелам праз інтэрнэт-сувязь калег з Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, а таксама Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Абмеркаванне выступленняў і дыскусія працягнуліся да 16 гадзін. З тэматыкай прачытаных дакладаў можна азнаёміцца ў праграме канферэнцыі, якая размешчана на афіцыйным сайце гістарычнага факультэта БДУ (*www.hist.bsu.by*). Па выніках працы канферэнцыі запланавана выданне зборніка навуковых артыкулаў.

***В. С. Макарэвіч***[1]

[1]*Виталий Сергеевич Макаревич* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Сяргеевіч Макарэвіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vitaly S. Makarevich*, PhD (history), docent; head of the department of history of Belarus of new and contemporary times, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *witalij@tut.by*